ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2020 № 275

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў**
**«Асновы мастацкага ткацтва»**
для XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Асновы мастацкага ткацтва» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вучняў XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень).

3. Мэта – сфарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне аб мастацкім ткацтве як самабытнай частцы нацыянальнай культуры і выпрацаваць адпаведныя дадзенаму віду дзейнасці кампетэнцыі.

4. Задачы:

даць вучням уяўленне пра ручное ўзорыстае ткацтва як важную частку традыцыйнай культуры беларусаў, цесна звязаную з матэрыяльным і духоўным жыццём народа;

пазнаёміць з рознымі відамі беларускага народнага ткацтва, іх мастацка-дэкаратыўнымі асаблівасцямі і галінамі выкарыстання;

навучыць асноўным падрыхтоўчым працэсам ткацтва – снаванню асновы, навіванню яе на навой запраўцы станка, самастойнай распрацоўцы эскізаў, запісу заправачных малюнкаў і розным прыёмам узорыстага ткацтва.

5. Формы і метады навучання і выхавання рекамендаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў XI класа, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу. На занятках рэкамендуецца выкарыстоўваць славесныя (гутарку, тлумачэнне), наглядныя (паказ, дэманстрацыю) і практычныя (практыкаванні) метады навучання, групавыя і індывідуальныя формы работы.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў навучэнца будуць сфарміраваны:

6.1. прадстаўленне аб развіцці мастацкага ткацтва на тэрыторыі Беларусі, выкарыстанні дэкаратыўных тканых рэчаў у традыцыйным адзенні, у хатнім побыце, сямейнай абраднасці;

6.2. веды аб асноўных тэхніках беларускага народнага ткацтва;

6.3. уменні ўзорыстага ткання.

7. Для правядзення заняткаў патрабуецца наступнае абсталяванне і інструменты:

ткацкія дошчачкі – тонкія квадратныя пласцінкі з адтулінамі па вуглах (адзін камплект складаецца з 20–24 дошчачак);

насценная і настольныя сновальні (для снавання нітак асновы);

настольныя ткацкія станкі – рамкі з прыстасаваннем для ўтварэння ткацкага зева;

ручныя ткацкія станкі гарызантальнага тыпу з чатырма панажамі; да кожнага з іх трэба мець па два камплекты зеваўтваральных прыстасаванняў – рэмізак: першы камплект – з дзвюх рэмізак – выкарыстоўваецца для вырабу тканін з браным, выбарным, ажурным, пераборным арнаментам, таму рэмізкі павінны быць з ніцянымі галевамі – «ніты»; другі камплект – з чатырох рэмізак – можа мець металічныя галевы (выкарыстоўваецца для асваення прыёмаў узорыстага ткацтва на чатырох панажах);

чаўнакі двух відаў: «лодачкі» з донцам (са шпулямі для кожнага чаўнака) і плоскія чаўнакі – «іглiцы»;

дошчачкі-«бральніцы» – вузкія лінейкі з адным завостраным канцом (выкарыстоўваюцца пры вырабу тканін з браным, выбарным, ажурным, пераборным арнаментам);

шырокія дошкі з адным завостраным канцом (выкарыстоўваюцца пры вырабу тканін з браным, выбарным, ажурным, пераборным арнаментам);

тонкія стальныя або лазовыя пруткі, па даўжыні роўныя шырыні станка; шнуры з пяцелькамі, завязанымі праз кожныя 20 см (выкарыстоўваюцца для фіксавання ўзорнага зева пры вырабе тканін з браным, выбарным, ажурным, пераборным арнаментам);

бёрды № № 50, 60, 75;

«радкі» – прыстасаванні для раўнамернага размеркавання нітак асновы пры навіванні іх на навой ткацкага станка;

«упругі» – прыстасаванні для падтрымання аднолькавай шырыні тканіны, якая вырабляецца на ткацкім станку;

плоскія кручкі (выкарыстоўваюцца для запраўкі нітак асновы ў металічныя галевы рэмізак і бёрды);

вязальныя кручкі розных нумароў (выкарыстоўваюцца пры мастацкім аздабленні краёў тканых вырабаў);

нажніцы;

іголкі з шырокімі вушкамі.

сшыткі ў клетку, ручкі, алоўкі, фламастэры.

Матэрыялы: баваўняныя ніткі № 10 белага, шэрага і чорнага колераў; шарсцяныя, паўшарсцяныя і акрылавыя ніткі розных нумароў і колераў, ніткі «мулінэ», «ірыс», «рамонак» чырвонага, чорнага і белага колераў.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

XI класс (35 гадзін)

Тэмы 1–2. Ручное ўзорыстае ткацтва – самабытны від беларускага народнага мастацтва. Традыцыйны асартымент узорыстых тканін. Асноўныя тэхнікі беларускага народнага ўзорыстага ткацтва і іх мастацка-дэкаратыўныя асаблівасці (2 гадзіны)

Наведванне этнаграфічнага музея. Знаёмства з вырабамі беларускага народнага ткацтва – традыцыйным касцюмам, ручнікамі, абрусамі, посцілкамі, а таксама з прыладамі для апрацоўкі льну, прадзення і ткацтва.

Тэма 3. Найпрасцейшыя спосабы ўзорыстага ткацтва. Выраб пояса або закладкі на дошчачках (3 гадзіны)

Практычныя заняткі. Знаёмства з прасцейшымі спосабамі ткацтва (ткацтва на дошчачках). Узоры вырабаў, вытканых на дошчачках (паясы, галаўныя павязкі, закладкі для кніг), спосабы іх вырабу. Распрацоўка эскіза вырабу на невялікую колькасць дошчачак (6–10), падрыхтоўка схемы запраўкі да яго. Запраўка дошчачак і ткацтва пояса.

Тэма 4. Ткацтва на двух нітах. Практычнае авалоданне рознымі прыёмамі двухнітавага ткацтва (2 гадзіны)

Знаёмства з канструкцыяй і прынцыпам работы ткацкага станка, працэсамі падрыхтоўкі да ткання, тэхнікай бяспекі пры рабоце на ткацкім станку. Мастацкія магчымасці двухнітовага ткацтва (палоска, клетка, прыёмы двухчаўночнага ткацтва, змяненне структуры палатна, іншыя сродкі дэкарыравання двухнітовай тканіны). Практычнае засваенне прыёмаў двухнітовага ткацтва. Розныя варыянты асновы: аднакаляровая, раўнамерная па шчыльнасці (для стварэння папярочнапаласатага, дробнаўзорыстага (двухчаўночнага) дэкору); з рознакаляровымі прасноўкамі (для стварэння падоўжных палосак і клетак); з двухколеравай асновай, запраўленай для ўтварэння ўзора «костачкі»; з нераўнамернай запраўкай у бёрда (для атрымання дэкору за кошт змены структуры палатна).

Тэма 5. Канструкцыя і прынцып работы ткацкага станка. Падрыхтоўка да ткання. Тэхніка бяспекі пры рабоце на ткацкім станку (1 гадзіна)

Закладное ткацтва – адна з найбольш старажытных і тэхналагічна простых тэхнік ручнога ўзорыстага ткацтва. Знаёмства вучняў з мастацка-дэкаратыўнымі асаблівасцямі тканін з закладным арнаментам. Прыклады ўжывання закладнога дэкору ў беларускіх народных тканінах (ручнікі Падняпроўя, Усходняга Палесся, Цэнтральнай Беларусі, наміткі-сярпанкі Столінскага р-на, розныя часткі жаночага адзення Гомельшчыны). Каларыт традыцыйных вырабаў і геаметрычны характар арнаментальных матываў закладнога ткацтва, магчымасць спалучэння яго з папярочна-паласатым і дробным шашачным узорам.

Падрыхтоўка эскіза міні-пано.

Тэма 6. Закладное ткацтва. Выраб дэкаратыўнага міні-пано (3 гадзіны)

Традыцыйныя тэхнікі беларускага ўзорыстага ткацтва ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя (браная тэхніка ткацтва). Аздабленне святочнага адзення – жаночых кашуль, фартухоў, намітак, а таксама ручнікоў-набожнікаў, абрусоў.

Авалоданне тэхнікай бранага ткацтва (двухуточны варыянт).

Тэма 7. Бранае ткацтва. Выраб сувеніра (сурвэткі, дарожкі) (4 гадзіны)

Развіццё традыцый беларускага народнага ткацтва ў сістэме мастацкіх промыслаў Беларусі, у прыватнасці ў навукова-вытворчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца».

Экскурсія ў навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца» або сустрэча з майстрам мастацкага ткацтва і яго вырабамі.

Тэма 8. Развіццё традыцый беларускага народнага ткацтва ў сістэме мастацкіх промыслаў Беларусі (1 гадзіна)

Выбарныя ўзоры ў традыцыйным беларускім тэкстылі (жаночыя сарочкі) у спалучэнні з бардзюрамі бранага ткання (Добрушскі, Буда-Кашалёўскі, Жлобінскі раёны Гомельскай вобласці). Выбарнае ткацтва Віцебшчыны (стараверскія ручнікі). Спалучэнне бранага і выбарнага ткацтва.

Тэма 9. Выбарнае ткацтва. Выраб закладкі (2 гадзіны)

Ажурныя льняныя тканіны («рэдчыкі») у паўночна-ўсходніх раёнах Віцебшчыны: ажурныя тканіны з папарнай і групавой перавіўкай нітак асновы, а таксама з камбінаванымі варыянтамі ажурнага перапляцення.

Тэма 10. Ажурпае ткацтва. Выраб дэкаратыўнай устаўкі для сукенкі (3 гадзіны)

Тэхніка чатырохрэмізнага (чатырохнітовага) ткацтва. Прынцыпы перапляцення чатырохнітовага ткацтва (аднаўточны і двухуточны), іх асаблівасці. Запіс заправачнага малюнка. Знаёмства з рознымі варыянтамі народных ручнікоў.Выраб тканага сувеніра на чатырох нітах.

Тэмы 11–12. Ткацтва на чатырох нітах. Выраб сувенірнага ручніка. Пераборнае ткацтва. Выраб футляра для акуляраў, дэкаратыўнай устаўкі для торбачкі (12 гадзін)

Разнавіднасці пераборнага ткацтва на Беларусі: перабор «пад палатно», перабор «пад паркі», аднабаковы перабор з прыціскной асновай, двухбаковы перабор з прыціскной асновай, перабор з выбарам, пяцельны перабор.

Аднабаковы і двухбаковы віды перабору з прыціскной асновай. Выраб living рознага асартыменту дэкаратыўных тканін – ручнікоў, абрусоў, дываноў, посцілак у другой палове XX стагоддзя. Двухбаковы перабор з прыціскной асновай.

Знаёмства з творамі народных майстрых. Асаблівасці арнаментальных матываў пераборнага ткацтва. Зрабіць

Распрацоўка эскіза невялікага вырабу (футляра для акуляраў або мабільнага тэлефона, дэкаратыўнай устаўкі для торбачкі) і выраб яго ў матэрыяле.

Тэма 13. Падагульняючыя заняткі (2 гадзіны)

Выстаўка творчых работ вучняў і іх абмеркаванне.